Янка Купала верыў у будучыню свайго народа, верыў у чалавека — стваральніка і пераўтваральніка гісторыі. Таму з такой паслядоўнасцю, ад твора да твора, славіў ён тых, хто імкнуўся да маральнай дасканаласці, хто прагнуў новай долі. Сапраўдным гімнам чалавеку з вялікай літары стала купалаўская паэма «Яна і я» — твор выключнай жыццёвай сілы, што паэтызуе звычайную сялянскую працу: выган жывёлы ў поле, ворыва, бяленне палатна, ткацтва, сяўбу, касьбу і г. д. А яшчэ паэт апявае жанчыну, каханне:

Раем на зямлі выглядваў нам сад,
Я ў ім — Адам, яна ў ім — Ева;
Ў раі гэтым вецер быў нам бог і сват,
Вяцьвямі шлюб давала дрэва.

Незвычайнай паэтызацыі дасягнуў Янка Купала ў паэме «Безназоўнае», напісанай у 1924 г. Гэта — сапраўдная песня Новай Беларусі, сацыялістычнай рэчаіснасці. «Беларусь на куце ў хаце сваёй села,— чарка мёду ў руцэ, пазірае смела». У гэтым жа творы гучаць і матывы пераемнасці пакаленняў. Паэт упэўнены:

Пакінем спадчыну мы для патомкаў
Іншую ад той,
Што ўзялі мы ад продкаў на абломках
Гісторыі сваёй...

Купалаўскі позірк у будучыню адчуваецца і ў вершы «Сыходзіш, вёска, з яснай явы...». Развітанне са старой вёскай для лірычнага героя, а значыць, і для самога паэта — працэс заканамерны. Паэт упэўнены, што новая рэчаіснасць народзіць і новыя святы, якія заўсёды будуць прыносіць радасць народу:

І будуць ладзіцца год кожны
На новы лад, на новы звычай
Дзяды Кастрычнікавы збожна,
А кожны год больш пераможна
Для свята волі бунтаўнічай.

Прароцтвы песняра збыліся. Новымі, савецкімі святамі сталі Кастрычнік і Першамай, у народныя абрады ператварыліся провады ў рады Савецкай Арміі і на пенсію, пасвячэнне ў рабочыя, атрыманне пашпарта і г. д.

Мы пакідаем сваім нашчадкам новую спадчыну, але разам з тым ашчадна ставімся і да ўсяго, што звязана з мінулым народа, з яго звычкамі, абрадамі. І Купалле, і Провады зімы — гэта ўсё ідзе яшчэ з сівой мінуўшчыны і ў той жа час яно — сённяшняе, блізкае нам, як і нашым папярэднікам. І светлай мелодыяй гучаць у сэрцы кожнага неўміручыя паэтавы радкі:

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай...

Асабліва блізкія і дарагія яны нам сёлета, калі ў дружнай сям'і савецкіх народаў разам з усім прагрэсіўным чалавецтвам свету адзначаем стагоддзе з дня нараджэння Янкі Купалы, паэта, якому наканавана неўміручасць.

# ЯКУБ КОЛАС ЯК ВУЧОНЫ

**Э. Р. ІОФЕ,**
**кандыдат гістарычных навук**

Пра Якуба Коласа як пісьменніка напісана шмат. Значна менш вядома пра навуковую дзейнасць класіка беларускай літаратуры.

Адзін з першых беларускіх савецкіх акадэмікаў, Якуб Колас увайшоў у гісторыю нашай навукі не толькі таму, што больш за 27 гадоў працаваў віцэ-прэзідэнтам АН БССР, а перш за ўсё як таленавіты лінгвіст, этнограф і фалькларыст. Акрамя таго, ён набыў вядомасць сваімі літаратурна-крытычнымі і публіцыстычнымі артыкуламі, змястоўнымі дакладамі на гістарычныя тэмы.

Навуковай дзейнасцю Якуб Колас пачаў займацца яшчэ ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, дзе напісаў першы літаратурна-этнаграфічны твор «Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле».

У этнаграфічных запісах, зробленых Міцкевічам-семінарыстам, галоўная ўвага ўдзяляецца апісанню народных прыкмет, звестак па народнай медыцыне, павер'ям, замовам.

Этнаграфічная праца «О крестьянских постройках (деревни Люсина, Минской губернии, Пинского уезда, Хотыничской волости)» дае падставу сцвярджаць, што перад намі ўдумлівае, сур'ёзнае даследаванне быту беларускага сялянства. Як адзначае этнограф Э. Р. Сабаленка, гэтая работа Коласа не страціла сваёй навуковай каштоўнасці і сёння. Па-першае, пісьменнік выявіў тут глыбокае веданне пытання, даючы падрабязныя, дэталёвыя апісанні сялянскага двара, хаты, гаспадарчых пабудоў, характарызуючы будаўнічую тэхніку, канструкцыю асобных дэталяў. Па-другое,



**Якуб Колас і прэзідэнт АН БССР М. І. Грашчанкоў (1948—1949 гг.).**



**Якуб Колас і прэзідэнт Акадэміі навук БССР В. Ф. Купрэвіч.**



**Якуб Колас на пасяджэнні вучонага савета АН БССР.**

цікавая гэта работа тым, што яна напісана на канкрэтным матэрыяле адной палескай вёскі. А пры той разнастайнасці будынкаў і іх размяшчэння, якая была характэрна для Палесся, такая праца з'яўляецца вельмі патрэбнай для стварэння агульнай карціны народнага палескага жылля [1].

Пасля перамогі Вялікага Кастрычніка Якуб Колас не займаўся этнаграфіяй, але ён заўсёды цікавіўся бытам беларускага народа. Менавіта тыя з'явы, якія сведчылі аб нараджэнні новага, савецкага быту, прыцягвалі найбольшую ўвагу народнага песняра. У лістападзе 1927 г. у газеце «Савецкая Беларусь» было апублікавана прывітанне Якуба Коласа з нагоды выхаду яе двухтысячнага нумару. У гэтым прывітанні ён пісаў: «Савецкая Беларусь» павінна больш увагі і месца удзяляць на сваіх старонках вясковаму жыццю. Трэба, каб у газеце адбіваліся тыя змены, якія ўнесла рэвалюцыя ў жыццё і будаўніцтва беларускай вёскі. «Савецкая Беларусь» і зараз асвятляе сялянскі быт, але ў большасці ў выглядзе фактаў. Трэба на фоне гэтых фактаў даць поўны малюнак новай вёскі».

Якуб Колас быў выдатным вучоным-лінгвістам. Менавіта гэта садзейнічала яго паспяховай дзейнасці ў рабоце Тэрміналагічнай камісіі, а затым у Інбелкульце і АН БССР.

30 студзеня 1922 г. на базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі была створана першая шматгаліновая навукова-даследчая ўстанова рэспублікі— Інстытут беларускай культуры.

Шмат часу, сіл і энергіі, увесь свой талент лінгвіста і мовазнаўцы аддаў народны пясняр навуковай дзейнасці ў сістэме Інбелкульта. Вось што ўспамінае яго паплечнік Я. Сушынскі:

«У 1921 г. пры Наркамасветы БССР была арганізавана Тэрміналагічная камісія на правах грамадскай дзейнасці без бюджэту. У склад камісіі ўваходзілі спецыялісты па мове, у тым ліку былі Якуб Колас, Янка Купала і шмат іншых.

Якуб Колас быў самым актыўным членам камісіі і ўносіў часта найбольш удалыя, трапныя і глыбокія народныя тэрміны ў той ці іншай галіне навукі...».

Актыўны ўдзел у станаўленні беларускай савецкай навукі і культуры прымаў пісьменнік Іларый Барашка, які добра ведаў Якуба Коласа. Ён пісаў, што Канстанцін Міхайлавіч з энергіяй уключыўся ў навуковую дзейнасць, якая пачала разгортвацца ў Мінску пасля вызвалення Савецкай Беларусі ад белапольскай акупацыі. Не пакідаючы сваёй педагагічнай работы, Канстанцін Міхайлавіч стаў прымаць актыўны ўдзел у Тэрміналагічнай камісіі, дапамагаючы слоўнікавай падкамісіі сваімі парадамі і кансультацыямі.

З 1922 па 1930 г. былі створаны і выдадзены спецыяльныя слоўнікі па 24 галінах навукі.

У 1926 г. выходзіць у свет «Методыка роднай мовы», падрыхтаваная Якубам Коласам. Гэтая метадычная кніга—буйная навуковая праца па беларускай мове, якая не страціла сваёй каштоўнасці і ў нашы дні.

Імя Якуба Коласа становіцца шырока вядома ў навуковых колах Савецкай Беларусі. У канцы 1924 г. ён выбіраецца правадзейным членам Інстытута беларускай культуры, а 26 снежня 1928 г. зацвярджаецца

[1] Э. Р. Сабаленка. Першыя этнаграфічныя працы Якуба Коласа. «Весці АН БССР». 1967, № 1, с. 84.

правадзейным членам Беларускай Акадэміі навук. 26 кастрычніка 1929 г. яго выбралі членам Прэзідыума АН БССР і яе віцэ-прэзідэнтам. Да апошніх дзён свайго жыцця заставаўся пісьменнік на гэтай пасадзе, актыўна садзейнічаючы развіццю і росквіту беларускай савецкай навукі.

Якуб Колас быў выдатным вучоным-фалькларыстам. У 1935 г. пры Прэзідыуме Акадэміі навук была створана фальклорная камісія, якую ён узначаліў. У 30-я гг. экспедыцыі, асобныя збіральнікі і краязнаўцы сабралі каля 80 тыс. фальклорных тэкстаў, 2 тыс. фоназапісаў. У 1940 г. выйшла з друку першая кніга шматтомнага акадэмічнага выдання «Песні беларускага народа».

Чалавек выключных энцыклапедычных ведаў, Якуб Колас добра ведаў гісторыю не толькі свайго роднага беларускага народа, але і братняга рускага народа. У лістападзе 1942 г. на сесіі АН БССР у Ташкенце ён выступіў з дакладам на тэму «Векавая дружба беларускага і рускага народаў і іх сумесная барацьба супраць нямецкай агрэсіі».

Навуковая дзейнасць Я. Коласа высока ацэнена партыяй і ўрадам рэспублікі. У азнаменаванне 25-годдзя ўтварэння БССР і за вялікія поспехі ў развіцці навукі Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР у студзені 1944 г. прысвоіў пісьменніку ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі БССР.

Навуковыя даследаванні Якуба Коласа, яго плённая арганізацыйная дзейнасць у Акадэміі навук Беларусі — яркая старонка ў гісторыі беларускай савецкай навукі.

**КІЕВУ — 1500 ГОД**

# НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

У Кіеве адбылася навукова-тэарэтычная канферэнцыя, прысвечаная 1500-годдзю горада. Яе праводзілі Украінскае, Усерасійскае і Беларускае таварыствы аховы помнікаў гісторыі і культуры.

На канферэнцыі прачытана 11 дакладаў. Аб 1500-годдзі Кіева як агульным свяце рускага, украінскага і беларускага народаў, усёй нашай шматнацыянальнай Радзімы, аб ролі горада ў эканамічным, палітычным і культурным жыцці ўсходнеславянскіх і іншых народаў СССР на ўсіх этапах гістарычнага развіцця нашай краіны, перамозе ленінскай нацыянальнай палітыкі КПСС і Савецкай дзяржавы расказаў старшыня савета Украінскага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры акадэмік АН УССР П. Т. Транько.

У дакладзе аднаго з даследчыкаў Кіева П. П. Талочкі асвятлялася пытанне аб узнікненні Кіева, фарміраванні яго тэрыторыі, ролі горада ў кансалідацыі ўсходнеславянскіх плямён і ўзнікненні першай дзяржавы ўсходніх славян — Кіеўскай Русі. Аб гістарычных помніках Кіева, звязаных з рэвалюцыйнымі і баявымі падзеямі, расказаў В. Г. Сарбей. В. І. Яжоў закрануў праблемы горадабудаўнічага развіцця Кіева і аховы помнікаў гісторыі і культуры. Тэме з гісторыі арганізацыі аховы помнікаў на тэрыторыі Украіны ў 1918—1920 гг. прысвячаўся даклад Ю. Н. Жукава. Аб ролі пісьменнасці Кіеўскай Русі ў фарміраванні рускай, украінскай і беларускай літаратур гаварылася ў дакладзе В. Л. Мікітася. Пра помнікі гісторыі і культуры Бранскай вобласці, якія адлюстроўваюць гістарычныя сувязі Расіі і Украіны, расказаў В. Л. Ягораў.

Чатыры даклады прачыталі прадстаўнікі Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. У дакладзе Ю. І. Афоніна былі адлюстраваны розныя формы супрацоўніцтва ўкраінскага і беларускага народаў у перыяд развітога сацыялізму і іх значэнне ў гаспадарчым і культурным развіцці братніх рэспублік. А. М. Кулагін расказаў пра творчасць Напалеона-Арды і магчымасць выкарыстання яго твораў у вывучэнні гісторыі архітэктуры Беларусі і Украіны. Двум выдатным археалагічным помнікам Старажытнай Русі, якія даюць яркае ўяўленне аб адзінстве і разнастайнасці матэрыяльнай і духоўнай культуры ўсходнеславянскай народнасці, што ляжыць у аснове культур рускага, украінскага і беларускага народаў, былі прысвечаны даклады Э. М. Загарульскага («Старажытны Мінск») і П. Ф. Лысенкі («Старажытнае Бярэсце»).

Канферэнцыя прайшла на высокім навуковым і тэарэтычным узроўні.